*Б. ХМЯЛІНЬСКІ*

# ГІСТОРЫЯ АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў ПОЛЬШЧЫ

Рассматривается история организации единственной за пределами Беларуси олимпиады по белорусскому языку. Отмечается значение этого мероприятия в укреплении дружеских связей между Республикой Беларусь и Польшей.

The article deals with the only Olympia Games of the Belarusian Language existing abroad and it organization. It underlines the role of this event in strengthening friendly relations between the Republic of Belarus and Poland.

Ініцыятыўная група дзеячаў і прыхільнікаў Таварыства Польшча-Беларусь, Беларускага грамадска-культурнага таварыства, Польскага таварыства беларусістаў, выкладчыкі шэрага польскіх ВНУ, настаўнікі беларускай мовы ў школах Беласточчыны 18лютага 1994 г. прынялі рашэнне распачаць арганізацыю Алімпіяды па беларускай мове. Ініцыятыўную групу, якая пазней ператварылася ў Галоўны камітэт Алімпіяды, складалі наступныя асобы: Баляслаў Хмяліньскі - Генеральны сакратар Таварыства Польшча-Беларусь; Аляксандр Баршчэўскі - загадчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і старшыня Польскага таварыства беларусістаў; Ян Сычэўскі - Старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы; Юзаф Брыль - віцэ-старшыня Таварыства Польшча-Беларусь; Яніна Вішнеўска - навуковы супрацоўнік аддзялення ўсходне-славянскай філалогіі філіяла Варшаўскага універсітэта ў Беластоку; Ян Зенюк - дырэктар комплексу ўстаноў па ўдасканаленню настаўнікаў у Беластоку; Міхал Саевіч - навуковы супрацоўнік універсітэта імя Складоўскай-Кюры і Каталіцкага Люблінскага універсітэта; Тамара Русачык - інспектар аддзела асветы ваяводскай адміністрацыі ў Беластоку; Валянціна Бабулевіч - настаўніца, метадычны кансультант беларускай мовы; Віктар Швед - беларускі паэт; Чэслаў Сенюх- перакладчык, сябра Польскага таварыства беларусістаў[1].

Намаганні ініцыятыўнай групы мелі поспех, бо былы віцэ-прэм'ер і адначасова міністр нацыянальнай адукацыі Рэспублікі Польшча Аляксандр Лучак выказаў згоду на арганізацыю Алімпіяды, пачынаючы з 1994/95 навучальнага года па-за межамі Рэспублікі Беларусь. Алімпіяда па беларускай мове атрымала катэгорыю прадметнай.

Патрэбу арганізацыі Алімпіяды па беларускай мове ў Польшчы (дагэтуль адзінай у свеце) ініцыятыўная група абгрунтавала тым, што ў Польшчы больш чым у сарака асноўных школах і двух агульнаадукацыйных ліцэях беларускую мову вывучаюць каля чатырох тысяч вучняў. Акрамя гэтага, беларуская філалогія ў той час існавала ў Варшаўскім універсітэце,

Каталіцкім Люблінскім універсітэце, універсітэце Марыі Складоўскай-Кюры ў Любліне і ў філіяле Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. У гэтых ВНУ беларускую філалогію вывучала каля 200 студэнтаў.

Ініцыятыўная група была глыбока пераканана, што Алімпіяда па беларускай мове паспрыяе папулярызацыі і прэстыжу гэтай мовы ў Польшчы, што пацвердзілася вынікамі прайшоўшых да гэтага часу дванаццаці Алімпіяд. Адзначым і іншыя мэты, якія ставіліся перад Алімпіядай на працягу 12 год - гэта абуджэнне зацікаўленасці моладзі духоўнай і матэрыяльнай культурай беларускага народа ў Польшчы і Беларусі, пашырэнне беларусазнаўчых ведаў у галіне літаратуры, мовы, культуры, фальклору, навук аб грамадстве, а таксама выяўленне літаратурных, моўных і культурных польска-беларускіх сувязей. Якасць, а не колькасць удзельнікаў была рашаючым чыннікам, інспіруючым арганізатараў Алімпіяды. У арганізацыйных правілах указвалася, што ідэя прыхільнасці да беларускай мовы і культуры павінна ісці ў пары з ідэяй адданасці польскай дзяржаве, якая з'яўляецца каштоўнасцю для ўсіх яе грамадзян.

Згодна з рашэннем Міністэрства нацыянальнай адукацыі арганізацыя Алімпіяды па беларускай мове ўскладзена на кафедру беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, якая вельмі цесна супрацоўнічае з Таварыствам Польшча-Беларусь[2]. У той час кафедру ўзначальваў вядомы па абодвух берагах Буга паэт Аляксандр Паршчэўка (Алесь Барскі).

Таварыства Польшча-Беларусь побач з галоўным спонсарам, якім для ўсіх прадметных алімпіяд у Польшчы з'яўляецца Міністэрства нацыянальнай адукацыі, падтрымлівае Алімпіяду фінансава і арганізацыйна. Старшынёй Галоўнага камітэта Алімпіяды стаў прафесар Аляксандр Баршчэўскі, які выконвае гэтую функцыю да сённяшняга дня. Месцам знаходжання Галоўнага камітэта Алімпіяды з'яўляецца Беласток.

Алімпіяда па беларускай мове ўваходзіць у трупу наступных прадметных алімпіяд, якія праводзяцца Міністэрствам адукацыі і спорту Рэспублікі Польшча: мастацкай, астранамічнай, матэматычнай, біялагічнай, хімічнай, фізічнай, геаграфічнай і мараплавальнай, гістарычнай, англійскай, французскай, лацінскай, нямецкай, рускай моў, польскай мовы і літаратуры, тэхнічных, эканамічных, філасофскіх ведаў.

У Алімпіядзе па беларускай мове ў першыя гады яе існавання маглі ўдзельнічаць вучні III і IV, а пасля рэформы адукацыі - II і III класаў агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляскім і Комплексу школ з дадатковым вывучэннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Да Алімпіяды маглі прыступіць таксама вучні I класа, калі яны мелі адпаведныя беларусазнаўчыя веды.

Алімпіяда мае трохступеньчаты характар: першая ступень - гэта школьныя спаборніцтвы, другая - акруговыя спаборніцтвы і трэцяя ступень-цэнтральныя.

<u>У спаборніцтвах першай ступені</u> ўдзельнічаюць самыя шырокія колы вучняў. Кожны, хто мае добрыя беларусазнаўчыя веды, валодае шырокай інфармацыяй пра польска-беларускія літаратурныя і культурныя сувязі, можа прыняць удзел у гэтых іспытах.

Правяраецца веданне матэрыялу з па-за школьнай праграмай: класічнай ці навуковай літаратуры, публіцыстыкі, якая датычыць Беларусі альбо польска-беларускіх сувязей.

Удзельнік рыхтуе пісьмовы пераказ і адказвае на пытанні калектыву экзаменатараў, які складаецца з настаўнікаў беларускай мовы дадзенай школы, у прысутнасці прадстаўніка Галоўнага камітэта Алімпіяды. Пры ацэнцы пісьмовых пераказаў галоўная ўвага звяртаецца на выкананы аналіз і інтэрпрэтацыю тэксту твора, характарыстыку герояў і разбор суадносін паміж імі, а таксама на стыль, мову і форму выказвання.

Да ўдзелу ў спаборніцтвах больш высокай ступені залічваецца вучань, які атрымаў прадугледжаную правіламі магчымую колькасць ачкоў (г. зн. 80 %).

Спаборніцтвы другой ступені, акруговыя, - разлічаны на пераможцаў першага этапа. Акруговыя спаборніцтвы маюць характар пісьмовага тэста і вуснага экзаменавання.

Мэтай пісьмовага тэста з'яўляецца выяўленне ведаў вучняў у галіне беларускай літаратуры і мовы, беларускай гісторыі і культуры, а таксама польска-беларускіх адносін. Састаўная частка гэтага экзаменавання - пераклад тэксту з беларускай мовы на польскую і з польскай на беларускую. Тэматыка экзаменавання звычайна тычыцца спецыфікі жыцця і культурных дасягненняў беларускай меншасці ў Польшчы.

Вусныя адборачныя спаборніцтвы грунтуюцца на сістэме пытанняў, якія адносяцца галоўным чынам да беларускай гісторыі, мовы і культуры і польска-беларускіх літаратурна-культурных сувязей. Экзаменатары таксама даюць магчымасць удзельніку выказацца на вольную тэму, якая ўкладваецца ў агульную канцэпцыю Алімпіяды. Журы акруговых спаборніцтваў складаецца з незалежных спецыялістаў. Да ўдзелу ў спаборніцтвах больш высокага этапа пераходзяць тыя, хто атрымаў 90 % ачкоў з магчымых.

Спаборніцтвы трэцяга этапа - цэнтральныя: у іх прымаюць удзел найлепшыя ўдзельнікі Алімпіяды па выніках акруговых экзаменаў.

Для правядзення цэнтральных іспытаў Галоўны камітэт Алімпіяды склікае Цэнтральную камісію, у складзе якой выкладчыкі і навукова-метадычныя супрацоўнікі кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і ўжо на працягу некалькіх гадоў - мовазнаўцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы.

Цэнтральныя спаборніцтвы праводзяцца ў форме экзаменавання - пісьмовага і вуснага. Іх мэта - максімальнае выяўленне здольнасцей удзельнікаў да самастойнага аналізу і магчымасці ахарактарызаваць тэмы выбраных пытанняў па беларускай літаратуры з улікам эміграцыйнай літаратуры і творчасці беластоцкага аб'яднання беларускіх пісьменнікаў «Белавежа». Пытанні датычацца беларускай мовы, беларускай культуры, а таксама польска-беларускіх літаратурных і культурных сувязей. Улічваюцца і высока ацэньваюцца веды сучаснай гісторыі Беларусі і актуальных падзей у Рэспубліцы Беларусь. Удзельнікі цэнтральнага спаборніцтва маюць магчымасць выказацца пісьмова і вусна на тэму жыцця беларусаў у пасляваеннай Польшчы, іх літаратурных, культурных і навуковых дасягненнях, а таксама разумения беларусамі паняццяў «Малая Радзіма» і «Вялікая Радзіма». Пісьмовае экзаменаванне мае ананімны характар. Падчас вуснага экзаменавання ўдзельнік мае права прапанаваць сваю тэму, што, аднак, не вызваляе яго ад абавязку адказваць на пытанні экзаменатараў.

Пераможцу трэцяга этапа прысвойваецца ганаровае званне лаўрэата Алімпіяды. Падкрэслім, што кожная з мінулых дванаццаці Алімпіяд мела своеасаблівую вядучую тэматыку аб знакамітых беларускіх класіках літаратуры. Так, напрыклад, IV Алімпіяда экспанавала ідэю рамантызму ў жыцці і творчасці Яна Баршчэўскага, Яна Чачота і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, крытыкі царскай сістэмы ў творчасці Францішка Багушэвіча і Канстанціна Каліноўскага, а таксама канцэпцыі пазітывізму ў літаратуры перыяду «Нашай Нівы». VI Алімпіяда была прысвечана паэме Якуба Коласа «Новая зямля» як вобразу беларускага сельскага жыцця; VIII - творчасці Максіма Танка; X Алімпіяда - знакамітай эмігрантцы-пісьменніцы Наталлі Арсеньевай (да 100-годдзя з дня нараджэння); XI - творчасці Васіля Быкава (з нагоды 80-годдзя з дня нараджэння); VII і XII Алімпіяды - Максіму Багдановічу (з нагоды 110-годдзя і 115-годдзя з дня нараджэння).

Правы лаўрэатаў і фіналістаў прадметных алімпіяд, згодна Закону Рэспублікі Польшча «Аб сістэме асветы» ад 7 верасня 1991 г., вызначае міністр, адказны за пытанні асветы і выхавання. Адпаведна яго загаду ад 2004 г., лаўрэаты і фіналісты Алімпіяды па беларускай мове набываюць наступныя правы: атрымліваюць ацэнку «выдатна» за даны вучэбны год; вызваляюцца ад экзамену на атэстат сталасці па беларускай мове на

падставе даведкі старшыні Галоўнага камітэта Алімпіяды, якая пацвярджае званне лаўрэата ці фіналіста (вызваленне ад экзамену на атэстат сталасці па беларускай мове раўназначна атрыманню ацэнкі «выдатна» па гэтай мове); атрымліваюць атэстат сталасці з адзнакай аб званні лаўрэата ці фіналіста Алімпіяды па беларускай мове, а замест выніку матуральнага (выпускнога дзяржаўнага) экзамену па гэтай мове атрымліваюць запіс «вызвалены»[3].

На працягу 12 год на ўсіх этапах спаборніцтваў (школьных, акруговых, цэнтральных) прынялі ўдзел звыш 1200 вучняў. Сярод іх званне лаўрэата і фіналіста атрымалі каля 300[4].

На падставе Закона «Аб вышэйшай адукацыі» і рашэнняў сенатаў польскіх ВНУ лаўрэаты і фіналісты маглі быць залічаны без уступных экзаменаў на спецыяльнасці: славянская і ўсходнеславянская філалогія, новагрэцкая філалогія, паланістыка, класічная філалогія, польская культура, філасофія, рэсацыялізацыя, грамадскія навукі і інш. Такімі ВНУ ў апошнія гады былі: Варшаўскі універсітэт, Ягелонскі універсітэт, Універсітэт імя Складоўскай-Кюры ў Любліне, Беластоцкі універсітэт, Каталіцкі Люблінскі універсітэт, Вармінска-Мазурскі універсітэт у Ольштыне, Акадэмія спецыяльнай педагогікі імя Марыі Гжэгажэўскай у Варшаве, Жэшаўскі політэхнічны інстытут імя Ігнацыя Лукасевіча.

Запамінальным для лаўрэатаў і фіналістаў стала традыцыйнае падвядзенне вынікаў алімпіяд, якое на працягу васьмі гадоў праходзіла ў Беларусі. Спачатку пераможцаў Алімпіяды і іх настаўнікаў прымалі ў Гродзенскай вобласці. Потым заключныя мерапрыемствы былі перанесены ў Мінск, у Дом дружбы і ў Беларускі дзяржаўны універсітэт.

Галоўнымі арганізатарамі заключных мерапрыемстваў былі: Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі, Таварыства Беларусь-Польшча, Міністэрства адукацыі Беларусі; сярод іх - прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў Беларусі, Міністэрства адукацыі Беларусі, Камітэта па справах рэлігій і нацыянальных меншасцей Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Беларускага фонду культуры, а таксама пісьменнікі, вучоныя, настаўнікі і журналісты. Памятныя падарункі заснавала таксама Пасольства Рэспублікі Беларусь у Польшчы і Пасольства Польшчы ў Беларусі.

Лаўрэаты і фіналісты падчас наведвання Беларусі мелі магчымасць глыбей пазнаёміцца з нацыянальнай культурай і гісторыяй, сустрэцца са сваімі беларускімі равеснікамі ў школах, клубах, асяродках творчай працы, што, несумненна, спрыяла ўстанаўленню і развіццю сяброўскіх кантактаў паміж моладдзю абедзвюх дзяржаў.

У 2006 г. Алімпіяда была ўключана ў план супрацоўніцтва Варшаўскага універсітэта і Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Гэтыя абставіны, несумненна, акажуць уплыў на арганізацыю і метадычны ўзровень гэтага мерапрыемства. Грамадскія арганізацыі, у тым ліку Таварыства Польшча-Беларусь, і надалей будуць падтрымліваць гэтую выдатную акцыю.

[1] Гл.: Справаздача з дзейнасці Таварыства Польшча-Беларусь (ТПБ) паміж I і II Кангрэсамі. Варшава, 1992 г. Архіў Таварыства супрацоўніцтва Польшча-Усход (ТСП-У). Ф. ТПБ.

[2] Гл.: Загад Міністра адукацыі і спорту РП. 15 сакавіка 1994 г. Архіў ТСП-У. Ф. ТПБ.

[3] Гл.: Загад Міністра адукацыі і спорту РП. 23 лютага 2004 г. Архіў ТСП-У. Ф. ТПБ.

[4] Гл.: Справаздача з дзейнасці Таварыства Польшча-Беларусь паміж II і III кангрэсамі. Варшава, 2002 г. Справаздача з дзейнасці Таварыства Польшча-Беларусь за 2005 г. Архіў ТСП-У. Ф. ТПБ.

Паступіў у рэдакцыю 22.06.06.

***Баляслаў Хмяліньскі*** - прафесар Акадэміі менеджменту ў Лодзі, старшыня Таварыства Польшча-Беларусь.